неполной. Городская среда является весьма подвижным объектом. Важно было бы оценить тенденции её развития. Для этого можно воспользоваться моделью нормативной типологии туристских центров, предложенную Вольфом из Йоркского университета. Суть этой типологии заключается в том, что туристские центры располагаются в системе декартовых координат, на одной из осей которой откладывается значение, равное по величине отрицательному либо положительному экономическому эффекту от туризма для данного туристского центра, а на другой – экологическому эффекту. Наиболее интересна не сама типология, а построенная Джеком Эллисом и некоторыми другими авторами на её основе модель эволюции туристского центра, находящей в общем случае выражение в разворачивающейся спирали:

Данная модель точно отражает динамику направление развития туристского центра в прошлом, однако сама по себе не может дать прогноза развития в будущем. В качестве показателя, характеризующего экономический эффект от туризма, можно взять баланс приезжающих и уезжающих из города туристов. Для характеристики экологического воздействия можно использовать интегральный показатель, учитывающий количество зелёных насаждений, наличие загрязняющих окружающую среду производств и др.

Исследование, подобное вышеописанному, может дать информацию, необходимую для совершенствования и развития рекреационной среды города, учитывая имеющиеся потребности и ресурсы для рекреации.

*Макарава А.А.*

# АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ: СТАН І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ

Аматарская мастацкая творчасць была і застаецца адной з найбольш актыўных формаў мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Як кожная з'ява культуры, аматарскае мастацтва — вельмі мнагамерны, шматузроўневы, моцны, жыццяздольны і поўны творчых сіл сацыяльны арганізм. На яе развіццё аказвае ўплыў сінтэтычны сплаў гістарычных, сацыяльна-псіхалагічных, эстэтычных, этнарэгіянальных, эканамічных і іншых фактараў.

Аматарская мастацкая творчасць як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Нягледзячы на існуючыя ў грамадстве сацыяльна-эканамічныя праблемы, ажыццяўленне сутнасных пераўтварэнняў у дзейнасці ўстаноў культуры і недахоп фінансавых сродкаў, "аматарскія мастацкія калектывы як грамадска-культурныя аб'яднанні аматараў музычнага, харэаграфічнага, тэатральнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва"[1,с.7-11], карыстаюцца ўстойлівым попытам у насельніцтва і актыўна садзейнічаюць дачыненню да беларускай традыцыйнай і сусветнай мастацкай культуры значнай часткі грамадзян нашай краіны.

Вядомы культуролаг А.І.Смолік, разглядаючы аматарскую мастацкую творчасць з пазіцый тэорыі культуры, сцвярджае, што «яна з'яўляецца састаўной часткай духоўнай культуры грамадства, якая спрыяе яе ўзбагачэнню і дэмакратызацыі, а таксама фарміраванню сістэмы вытворчасці і распаўсюджванню эстэтычных каштоўнасцей»[2,с.130-131]. Нельга не пагадзіцца з беларускімі даследчыкамі У.П.Скараходавым і І.В.Пыж, што «народная мастацкая творчасць—гэта найважнейшы пласт нацыянальнай культуры, яе аснова, без якой немагчыма фарміраванне нацыянальнай свядомасці і развіццё прафесійнага мастацтва». Аналіз сацыякультурных працэсаў ў сучаснай народнай мастацкай творчасці дае аўтарам падставы для вываду, што «масавасць, уласцівая аматарскай творчасці, дазваляе ёй быць глебай мастацкага жыцця беларускага грамадства, носьбітам і паказчыкам яго патэнцыяльных магчымасцей у культурастваральнай дзейнасці» [3, с.91].

Аналіз практыкі дае падставу для меркаванняў, што рух аматарскай творчасці ў Беларусі – асаблівая і вельмі цікавая з'ява беларускай культуры. Ён адчувае на сабе сацыяльна-гістарычныя ўплывы, якія перажываў беларускі народ на розных этапах сваёй гісторыі. Па сутнасці з'яўляючыся працягам масавай аматарскай самадзейнасці савецкага часу, сучасная аматарская творчасць увабрала ў сябе унікальную беларускую ментальнасць і працягвае дэманстраваць уласцівую нашаму народу таленавітасць, жыццялюбства. У розных рэгіёнах краіны існуе значная колькасць такіх мастацкіх фарміраванняў, заўважальных сваёй адметнасцю, якія творчай працай уносяць значны ўклад у нацыянальную культурную скарбонку: у захаванне традыцыйнай культуры, яе рэгіянальных формаў, дэманструюць найвышэйшы кшталт у відах і жанрах сучаснага мастацтва, яўляюць сабой ці традыцыю, ці навацыю ў спосабах дэманстрацыі творчых здабыткаў. І з'яўляюцца, можа, самым натуральным, спосабам фарміравання нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры праз прапаганду гэтых каштоўнасцей усімі даступнымі ёй формамі і метадамі.

Пазітыўныя зрухі, што можна назіраць у апошнія гады ў аматарскай творчасці, непасрэдна звязаны з актывізацыяй канцэртнай дзейнасці ў рэгіёнах. Увогуле, культурнае жыццё рэгіёнаў Беларусі сёння ў значнай ступені вызначаецца культурна-творчай і канцэртна--відовішчнай дзейнасцю, якую ажыццяўляюць менавіта калектывы аматарскай мастацкай творчасці.

Так, па статыстычных даных, больш як за 30 тысяч аматарскіх мастацкіх калектываў працуе ва ўстановах культуры і адукацыі нашай краіны, у тым ліку 12 тысяч рознапрофільных клубных фарміраванняў для дзяцей і падлеткаў. Значная колькасць калектываў мастацкай самадзейнасці належыць менавіта установам культуры клубнага тыпу розных ведамстваў (4700), у першую чаргу дзяржаўным клубным установам (4260), якія з'яўляюцца сапраўднымі цэнтрамі развіцця аматарскай творчасці і сацыяльна-культурных ініцыятыў, надаюць арганізаваны характар розным відам і формам мастацкай дзейнасці насельніцтва [4, с.61].

Аб высокім мастацкім узроўні развіцця аматарскай творчасці сведчыць колькасць "народных" і "ўзорных" калектываў. Колькасць іх значная і выглядае даволі пераканаўча - больш за 1600. Толькі ў дзяржаўных клубных установах працуе 936 «узорных» і «народных» аматарскіх калектываў (на канец 2001г.) [4, с.68]. Штогод каля 50 калектываў аматарскай творчасці розных жанраў і кірункаў, якія працуюць у дзяржаўных клубных установах, атрымоўваюць ганаровыя званні «народны» і «ўзорны».

Важным кірункам у стымуляванні і развіцці аматарскай творчасці з'яўляюцца міжнародныя, рэспубліканскія і рэгіянальныя фестывалі. Штогод іх праводзіцца каля 50, у тым ліку і стаўшыя ўжо традыцыйнымі: міжнародны фестываль аматарскай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», рэспубліканскі фестываль народнага танца "Беларуская полька", Усебеларускі фестываль народнага гумару «Аўцюкі - 2000», Міжнародны фестываль юных талентаў «Зямля пад белымі крыламі» і інш. Важным творчым стымулам для аматарскіх мастацкіх калектываў і эфектыўнай формай прапаганды беларускага мастацтва сталі таксама традыцыйныя фестывалі, святы, канцэрты, якія з'яўляюцца сапраўднай візітоўкай культуры Беларусі, абласцей, рэгіёнаў краіны: "Славянскі базар", "Залаты шлягер", "Сожскі карагод", Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, у якіх паспяхова прымаюць удзел аматарскія мастацкія калектывы і асобныя выканаўцы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самым галоўным аглядам стану аматарскай творчасці стаў Першы рэспубліканскі фестываль народнага мастацтва "Беларусь – мая песня", па выніках якога 95 калектываў і 55 асобных выканаўцаў, 47 народных майстроў атрымалі званне "лаўрэат фестывалю".

Даследаванні, праведзеныя аддзелам ўстаноў культуры і аматарскай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з удзелам супрацоўнікаў аддзела аматарскай творчасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры і выкладчыкаў кафедры менеджменту сацыякультурнай сферы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры ў розных абласцях і этнарэгіёнах Беларусі на працягу 1998-2001 гг., дазваляюць нам вызначыць некаторыя асноўныя тэндэнцыі развіцця аматарскай мастацкай творчасці:

- назіраецца пэўная стабілізацыя аўдыторыі мастацтва і аматарскай творчасці;
- агульная колькасць прыхільнікаў (наведвальнікаў) канцэртна-відовішчных праграм аматарскіх калектываў застаецца адносна пастаяннай на працягу апошніх 3-5 год;
- адчуваецца актуалізацыя патрэбнасці насельніцтва рэгіёнаў краіны да кантактаў з жывым мастацтвам праз аматарскую мастацкую творчасць;
- эфектыўнасць уплыву аматарскай творчасці на сацыякультурнае жыццё рэгіёнаў краіны застаецца значна высокай і нават расце;
- адбываецца актывізацыя грамадскіх інтарэсаў да відаў аматарскай творчасці, заснаваных на гістарычна-культурных традыцыях;
- набывае асаблівы сэнс і культуралагічную каштоўнасць зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэнне ў сучасным культурным жыцці традыцыйных узораў аматарскай творчасці;
- значна актывізавалася дзейнасць мастацкіх калектываў, створаных пры нацыянальна-культурных аб'яднаннях;
- вызначаецца спроба стварэння раённых філарманічных арганізацый на базе існуючых клубных структур у Слуцку, Маладзечне, Стоўбцах, Глыбокім і інш.;
- падтрымка нормаў канцэртна-філарманічнага жыцця ў раёнах патрабуе як жанравай разнастайнасці мастацкіх аб'яднанняў, так і дастаткова высокага ўзроўню іх выканаўчага майстэрства;
- назіраюцца ўстойлівая тэндэнцыя развіцця асобных жанраў аматарскай творчасці з апорай на здабыткі акадэмічных відаў мастацтва;
- узрастае роля індывідуальнага фактару пры выбары відаў аматарскай дзейнасці, формаў арганізацыі вольнага часу, зместу яго за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паўнення; устаноўка на самапраяўленне і самавызначэнне, не столькі на сумесную калектыўную творчасць, колькі на асобасны кантакт з мастацтвам праз аматарства: выяўленчае мастацтва, народныя промыслы, дызайн, бардаўскую песню, сольныя эстрадныя спевы;

- пашыраецца працэс стандартызацыі і тыражавання тыповых відаў і формаў аматарскай дзейнасці, мадэлей сацыяльна-культурнай актыўнасці ў сферы мастацкай творчасці (пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі, у першую чаргу, — тэлебачання; папулярызацыя аматарскай дзейнасці, звязанай з сучаснай тэхнікай, камп'ютэрам); адчуваецца значны ўплыў на аматарскую творчасць з боку сучаснага шоу-бізнесу і індустрыі музычнага забаўляння.
- ідзе актыўны працэс фарміравання фестывальных традыцый аматарскай мастацкай творчасці як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях;
- рэгіяналізацыя выступае сёння як адна з найбольш відавочных тэндэнцый у развіцці ў нашай краіне; пры наяўнасці агульных тэндэнцый у аматарскай мастацкай творчасці развіццё яе розных відаў і жанраў у рэгіянальным плане адбываецца неаднолькава;
- як адна з формаў паслуг насельніцтву, канцэртна-творчая дзейнасць аматарскіх мастацкіх аб'яднанняў дазваляе ў некаторай ступені вырашаць пытанні самафінансавання ўстаноў культуры;
- сучасныя формы мастацка-творчай актыўнасці моладзі (поп-, рок-музыка, джаз, бардаўская песня, дызайн і г.д.), пакуль што не знаходзяць дастатковага развіцця ў межах клубнай практыкі.

Вяртанне да культурна-гістарычных традыцый – адзін з найбольш актыўных сацыяльна-культурных працэсаў, што адбываецца зараз у аматарскай творчасці паўсюдна ў рэгіёнах Беларусі [5, с.38-43]. Аматарская мастацкая творчасць ў Беларусі характарызуецца, у першую чаргу, зваротам да традыцыйнай мастацкай культуры. У працэсе гістарычнага развіцця "беларускі этнас набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і існуюць у такіх адносна ўстойлівых формах, як мова, традыцыі, абрады, народная творчасць, этнічная самасвядомасць, тапаніміка, культура, лад паўсядзённага жыцця і г.д. [6, с.15].Звяртаючы увагу на ўзнаўленне фальклорных традыцый у аматарскай творчасці, неабходна падкрэсліць, што аўтэнтычны фальклор як «першасны від традыцыйнай мастацкай культуры ў яго спрадвечным выглядзе існуе ў натуральным вясковым асяроддзі, мае старажытныя карані, перадаецца з пакалення ў пакаленне вусным шляхам, выяўляецца праз носьбітаў фальклору (спевакоў, музыкаў, танцораў, казачнікаў, майстроў, знаўцаў мясцовай традыцыі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звычаяў)». Аматарская творчасць, узнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, такім чынам, выступае ў якасці самастойнай падсістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі" [7].

Сутнасць дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва, у тым ліку аматарскай творчасці і сацыяльна-культурнай сферы вызначана ў шэрагу заканадаўчых актаў: Законе "Аб культуры ў Беларускай ССР", "Палажэнні аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь", "Палажэння аб народным самадзейным калектыве мастацкай творчасці Рэспублікі Беларусь" і іншых, якія забяспечваюць дастаткова высокую ступень свабоды культурна-творчай дзейнасці грамадзян, даюць магчымасць наваўвядзенняў і сацыяльна-арганізацыйнага эксперыментавання у галіне аматарскай творчасці.

У сучасны перыяд жыцця нашага грамадства, які характарызуецца складаным сацыяльна-эканамічным становішчам, роля дзяржавы як гаранта культурнай палітыкі значна ўзрастае. Безумоўна, такой складанай і шматузроўневай сістэме, якой з'яўляецца сучасная аматарская творчасць Беларусі, нельга навязваць шляхі развіцця з боку дзяржаўных органаў кіравання, не абапіраючыся на уласны закон кожнай з яе падсістэм. Хутчэй, трэба ўсяляк садзейнічаць унутраным тэндэнцыям яе развіцця, вызначыўшы пры гэтым змяненні ў характары упраўлення культурнымі працэсамі на аснове іх выбарачнага эканамічнага стымулявання і забяспечыўшы неабходнай заканадаўча-прававой абаронай.

Менавіта з мэтай падтрымкі і стымулявання аматарскай творчасці ў нашай краіне праводзяцца гэтыя шматлікія конкурсы, фестывалі і іншыя сацыяльна-культурныя акцыі. Пералічаныя формы арганізацыйна-творчай і навукова-метадычнай падтрымкі аматарскай творчасці з'яўляюцца найважнейшым кірункам дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання і дзейсным спосабам ўплыву на працэсы яе развіцця [8 ].

Адным з найбольш эфектыўных спосабаў уплыву на дзейнасць аматарскіх калектываў з'яўляецца прысваенне ганаровых найменняў - «народны (узорны) самадзейны калектыў мастацкай творчасці» як формы праяўлення грамадскага прызнання значнасці ўкладу аматарскага калектыву ў развіццё мастацкай культуры і культурнае абслугоўванне насельніцтва. Практыка стымулявання дзейнасці аматарскіх мастацкіх калектываў праз прысваенне гэтых найменняў прайшла выпрабаванне часам і даказала сваю дзейснасць[10]. Прысваенне звання «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь» - новы для на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шчай краіны падыход у падтрымцы мастацкіх калектываў, якія ва ўмовах вольнага часу ажыццяўлюць шырокую канцэртна-гастрольную дзейнасць, спрыяюць развіццю мастацкай творчасці, далучэнню насельніцтва да каштоўнасцей мастацкай культуры. Гэта спроба падтрымкі ў сучасных эканамічных умовах найбольш самабытных і яркіх у мастацкіх адносінах калектываў. Неабходнасць такога патранажу з боку дзяржавы не выклікае сумнення.

Зразумела, што культурная палітыка ў галіне аматарскай мастацкай творчасці павінна абапірацца на навукова абгрунтаваныя вывады. Сучасныя даследаванні ў галіне аматарскай творчасці ў Беларусі дазваляюць канстатаваць, што практыка развіцця аматарскай мастацкай творчасці пайшла далёка наперад ад яе навукова-тэарэтычнага асэнсавання [8, 9]. Становішча з навукова-тэарэтычнай распрацоўкай праблем аматарскага мастацтва ў нашай краіне застаецца вельмі складаным, адчуваецца недахоп інтэлектуальнага асэнсавання сучасных працэсаў і пераўтварэнняў у галіне аматарскай творчасці і сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Спецыялісты галіны аматарскай творчасці, работнікі культуры ў рэгіёнах не атрымоўваюць неабходнай навуковай падтрымкі і падпіткі сваёй дзейнасці, што вядзе да значных і часам небяспечных ухілаў у практыцы кіравання мастацка-творчай дзейнасцю аматарскіх калектываў, да зніжэння сацыяльнай эфектыўнасці культурна-творчай работы з насельніцтвам.

Патрабуецца больш разгорнутае навукова-тэарэтычнае асэнсаванне тых з'яў, што адбываюцца ў аматарскай мастацкай творчасці ў розных рэгіёнах краіны. Бачыцца неабходным правядзенне спецыяльных сацыялагічных даследаванняў, прысвечаных праблемам бытавання самых розных відаў і жанраў аматарскай творчасці. Неабходна пашырэнне кола навуковых тэм і даследаванняў, прысвечаных сацыякультурнаму жыццю розных рэгіёнаў краіны і выяўленню дынамікі развіцця аматарскай мастацкай творчасці, якая праз зварот да традыцыйных высноў беларускай нацыянальнай культуры набывае новы якасны ўзровень і эстэтычную значнасць.

Асэнсаванне усіх аспектаў функцыяніравання аматарскай мастацкай творчасці ў нашым грамадстве павінна адбывацца з агульнафіласофскіх і культуралагічных пазіцый. Для гэтага неабходна прыцягненне шырокага кола спецыялістаў з ліку культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, сацыёлагаў, эканамістаў і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЛІТАРАТУРА:

1. Палажэнне аб самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь //Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці. — Мінск: БелІПК, 1999. — С.7-11.

2. Смолік А.І. Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме: Вучэб. дапам. для выш. і сярэд. спец. навуч. ўстаноў. — Мінск: Бел. ун-т культуры. — 1999. – С.130-131.

3. Скараходаў У.П., Пыж І.В. – Сацыякультурныя працэсы ў народнай мастацкай творчасці // Беларуская культура сёння.—Мінск: БелДІПК, 2003. — С.91-104.

4. Статыстычна партрэт культуры Беларусі: Агляд тэатр.-відовішч. і культ.-асвет. устаноў сістэмы М-ва культуры РБ / БелДІПК. — Мінск, 2003. – С.66-68.

5. Варфаламеева Г.Б. Гэты яўны патаемны свет фальклору //Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.— Мінск: БелІПК, 1997.— С. 38-43.

6. Смятаннікаў В.С. Беларусазнаўства: Вучэбна-метад. дапам. для выкладчыкаў сярэд.спец. навуч.устаноў. — Мн.: Беларуская навука, 2000. — 149 с.

7. Варфаламеева Т.Б., Боганева А.М. Рэкамендацыі па ахове, захаванню, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору.— Мінск: БелДІПК, 2001.— 12 с.

8. Макарава А., Сівурава Л. Аб шляхах фарміравання фестывальных традыцый ў самадзейнай мастацкай творчасці// Веснік БелІПК за 1998 г: Навук.-метад. зб. — Мінск: БелІПК, 1999. — С.107. —112.

9. Макарава А.А. Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў дзейнасці сучасных клубных устаноў // Інфармацыйныя матэрыялы да Рэспубліканскага семінара «Новыя падыходы да праблем сельскай культуры» (Мінск, 14-15 снеж. 2000 г.). — Мінск: БелІПК, 2001. — С.29-51.

10. Даведнік калектываў аматарскай творчасці Рэспублікі Беларусь, якія маюць званні “народны” і “узорны”.- Мн.: БелІПК, 1998. - 122 с.

11. Палажэнне аб народным самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь //Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці. — Мінск: БелІПК, 1999. — С.14—17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ